***В. В. Нікалаенка***
*Навук. кір.* ***А. А. Станкевіч,***
*д-р філал. навук, прафесар*

## АНТЫТЭЗА І ЯЕ СТЫЛІСТЫЧНАЯ РОЛЯ Ў ПРЫКАЗКАХ І ПРЫМАЎКАХ

Прыказкі і прымаўкі ўяўляюць сабой скарбы народнай мудрасці. Тэматычна яны надзвычай разнастайныя: каханне, шлюб і вяселле, сям'я і ўнутрысямейныя адносіны, духоўнае жыццё, праца, чалавек і яго якасці, паводзіны і іншыя тэмы. Актыўным сродкам слоўнай вобразнасці ў прыказках і прымаўках з'яўляецца антытэза, заснаваная на выкарыстанні антонімаў, якая садзейнічае стварэнню кантрасту і павышэнню выразнасці.

Большасць прыказак і прымавак, у якіх выкарыстоўваецца антытэза, адлюстроўвае філасофскія погляды народа на жыццё і вучыць разумна жыць: *"Закінь наперад, ззадзі знойдзеш"* [1]; *"Беражы галаву ў холадзе, жывот у холадзе, а ногі ў цяпле"*; *"Будзеш давахай, будзеш і брахай"*.

Многія прыказкі і прымаўкі прасякнуты гумарам, а часам, і вострай іроніяй, бо выкрываюць пры дапамозе антытэзы розныя людскія заганы: *"Сёння гуляшкі, а заўтра без рубашкі"*; *"Добры і богу трэба, а благога і чорт не бярэ"*; лісліваслць:*"Хоць малы, але вялікаму лапці падпляце"*; хітрасць *"Анёлам ляцеў, а чортам сеў"*; самахвальства: *"Сваё хваліць, а чужое пад плот валіць"*; махлярства: *"Злодзей сонейка баіцца, але і месяца таіцца";* балбатню: *"Болей слухай, меней гавары"* і іншыя.

Адну з найбольш вялікіх тэматычных груп складаюць прыказкі і прымаўкі, якія адлюстроўваюць такую сферу чалавечага жыцця, як замужжа і ўнутрысямейныя адносіны: *"Не спяшы замуж: калі плоха – нагаруешся, а калі добра – нажывешся"*, *"На дзень вяселле, а навек мучэнне"*, *"Добры сем'янін у хату горнець, а благі з хаты выносіць"*, *"Муж стары, жонка малада, то агонь да вада"*.

Многія прыказкі так ці інакш звязаны з працоўнай дзейнасцю людзей, і менавіта працу народ у сваіх прыказках ставіць вышэй за ўсё, падкрэсліваючы яе найпершае значэнне ў сваім жыцці: *"Не астаўляй на заўтра тое, што можна зрабіць сягодні"*.

Такім чынам, прыказкі і прымаўкі, пабудаваныя на супрацьпастаўленні пэўных дзеянняў, якасцей і ўласцівасцей, вызначаюцца кантрасным паказам розных бакоў жыцця народа, высокай экспрэсіўнасцю і эмацыянальнай напоўненасцю.

### Літаратура

1 Прыклады падаюцца паводле слоўніка: Прыказкі і прымаўкі ў дзвюх кнігах. Кн. 2 / гал. рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1967. – 616 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БрГУ имени А. С. Пушкина

***А. М. Рашанок***
*Навук. кір.* ***В. С. Новак,***
*д-р філал. навук, прафесар*

## МАСЛЕНІЧНЫЯ АБРАДЫ І ЗВЫЧАІ БЕЛАРУСАЎ

У сістэме каляндарнай абраднасці беларусаў важнае месца адводзіцца масленічным абрадам і звычаям. Паводле меркаванняў даследчыка А. С. Ліса, "Масленіца стаяла на мяжы двух цыклаў" [1, с. 41]. Адзначым, што Масленіца святкуецца цэлы тыдзень, кожны яго дзень атрымаў адпаведную назву, і суправаджаўся пэўнымі рытуаламі, гульнямі, песнямі. З шэрагу іншых дзён масленічнага тыдня вылучаецца чацвер, які меў назву Святога Уласа – ахоўніка свойскай жывёлы.

Асноўнымі структурнымі кампанентамі масленічнай абраднасці беларусаў з'яўляюцца гушканне на арэлях; звычай "вешаць калодку" хлопцу, які своечасова не ажаніўся, або дзяўчыне, якая не выйшла да гэтага часу замуж; ушанаванне бабкі-павітухі; велічанне маладой жанчыны; звычай пад назвай "Цешчыны пачастункі"; звычай "Прасіць прабачэння ў родзічаў"; спальванне саламянага пудзіла, якое сімвалізавала вясну; "аб'езд коней"; катанне на санках.

Вялікае значэнне надавалася падчас святкавання Масленіцы рытуальнай ежы. Невыпадкова ў песнях шырока абыгрываюцца: масла, сыр, малодзіва, тварог ("сырам гору набівалі", "маслам гору палівалі", "а ад масла – гара ясна"). Варта адзначыць, што на святочным стале шчодра выстаўляліся малочныя прадукты, якія, можна меркаваць, выконвалі сімвалічную ролю ахвярыпрынашэння Богу Вялесу, апекуну сялянскай гаспадаркі. Засяродзім увагу на адным са структурных кампанентаў масленічнай абраднасці – звычаі "вешаць калодку". Паводле сведчанняў жыхароў в. Насовічы Добрушскага раёна, "у панядзелак на масленічным тыдні збіраюцца бабы з усёй вёскі, бяруць пояс ці папругу і прывязываюць да аднаго канца абрубак дрэва. Ловяць хлопцаў, што не жаніліся і прывязываюць канец папругі да яго нагі, як бы ў пакаранне за тое, што не жаніўся" [2, с. 222].

Асноўная скіраванасць масленічных абрадаў і звычаяў беларусаў – звязана з надыходам вясны, забеспячэннем добрага ўраджаю на палетках і сямейнага дабрабыту.

### Літаратура


1 Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / уклад. А. І. Гурскага і інш. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 405 с.

2 Зямля чароўная дабра: Добрушскі край: гісторыя і сучаснасць / пад агульнай рэдакцыяй А. А. Станкевіч. – Гомель: ААТ "Полеспечать", 2008. – 280 с.



***Ю. А. Шкуратов***
*Науч. рук.* ***Н. П. Капшай,***
*канд. филол. наук, доцент*


## ЧИТАТЕЛЬСКАЯ РЕЦЕПЦИЯ РОМАНА В. А. КАВЕРИНА «ДВА КАПИТАНА»

Формирование читательской рецепции, особенности исторического функционирования произведения – актуальный вопрос современного литературоведения, который может проясниться только в интеграции нескольких научных дисциплин. На решении проблемы сосредоточено историко-функциональное литературоведение. Оно собирает отзывы читателей разных исторических эпох. Методом анкетирования и беседы выявляются особенности рецепции произведения современным читателем. Необходим здесь и метод психоанализа.

Предметом нашего исследования стал роман В. Каверина «Два капитана». С момента издания произведения прошло уже семьдесят лет, но дети, подростки и взрослые перечитывают книгу снова и снова. Интересует читателя уже история создания романа. Источником стали реальные прототипы: образ Сани Григорьева – генетик М. Лобашёв, капитан Татаринов – капитан Седов. Во время второй мировой войны сам Каверин работал военным корреспондентом газеты «Известия». Каверин был знаком с бытом полярников, общался с лётчиком Клебановым, рассказавшим много интересного о самолётах. Роман столь привлекателен, потому что «литература – естественное продолжение нашей жизни» [1].

Источниками, претендующими на объективность исследования, представляются нам интернет-ресурсы. На сайте livelib.ru книга «Два капитана» входит в топ-100 лучших книг и занимает в нём 50-е место. В опросе 249 поклонников этого романа в группе

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ